Валянціна АСТРОГА

# Адносіны царызму да настаўніцтва Беларусі

## (другая палова XIX—пачатак XX ст.)



*АСТРОГА Валянціна Міхайлаўна — старшы выкладчык кафедры гісторыі Беларусі і паліталогіі Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага універсітэта. Нарадзілася ў Пастаўскім р-не Віцебскай вобл. У 1990 г. закончыла гістарычны факультэт БДУ, у 2004 г. — аспірантуру БДУ. У 2005 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю "Вясковае настаўніцтва Беларусі ў другой палове XIX—пачатку XX ст.". Сфера навуковых інтарэсаў — гісторыя народнай асветы Беларусі ў другой палове XIX—пачатку XX ст. Аўтар 30 навуковых публікацый.*

У другой палове XIX ст. у еўрапейскіх краінах хуткімі тэмпамі развіваліся капіталістычныя грамадска-эканамічныя адносіны, што стварыла патрэбу ў пашырэнні пісьменнасці насельніцтва і развіцці прафесійнай адукацыі. У Беларусі ў гэты час, нягледзячы на кансерватыўную палітыку царызму, узніклі спецыяльныя педагагічныя навучальныя ўстановы, былі зроблены першыя спробы правядзення настаўніцкіх з'ездаў і нарад, стварэння прафесійных саюзаў. Настаўніцтва на мяжы XIX—XX стст. складала значную частку інтэлігенцыі Беларусі, іграла асобую ролю ў жыцці грамадства. Незадаволенае сваім грамадскім статусам, яно пачало барацьбу за паляпшэнне матэрыяльнага і прававога становішча.

Для больш глыбокага асэнсавання працэсаў беларускага адраджэння неабходна асэнсаваць і засвоіць усё пазітыўнае, што было назапашана за другую палову XIX і ў пачатку XX ст. Асаблівую каштоўнасць уяўляе вопыт прафесійнай падрыхтоўкі і дзейнасць дзяржавы ў вырашэнні кадравага пытання ў галіне народнай адукацыі. Актуальнасць тэмы вызначае і тое, што да гэтага часу фактычна няма спецыяльнага даследавання дадзенай праблематыкі. Асобныя аспекты тэмы ў той ці іншай ступені закранаді ў сваіх працах С.В.Снапкоўская, В.М.Лухверчык, М.К.Кірылаў, А.І.Краўцоў, М.В.Чэхаў і інш.

Зазначым, што на беларускіх землях развіццё школьнай адукацыі мела свае асаблівасці. Спачатку школы засноўваліся праваслаўнай царквой, потым каталіцкай, затым узніклі пратэстанцкія, езуіцкія, брацкія і уніяцкія школы. Пасля далучэння да Расійскай імперыі ў 1803 г. была створана Віленская навучальная акруга. Вучэбна-метадычным і адміністрацыйным цэнтрам акругі з'яўляўся Віленскі універсітэт. Затым Віленская навучальная акруга неаднаразова рэарганізоўвалася.

17 студзеня 1829 г. створана Беларуская навучальная акруга з цэнтрам у Віцебску. Згодна з палажэннем аб навучальных акругах 1835 г. універсітэты вызваляліся ад кіраўніцтва навучальнымі ўстановамі, гэту функцыю выконвалі папячыцельскія саветы на чале з папячыцелем, які прызначаўся імператарскім указам. У 1850 г. Віленская навучальная акруга адноўлена. У яе ўваходзілі навучальныя ўстановы Віленскай, Гродзенскай, Ковенскай і Мінскай, а з 1864 г. таксама Віцебскай і Магілёўскай губерняў.

Беларусь стала, на думку педагога і грамадскага дзеяча Ф.Елянёва, «не дачкой, а падчаркай Расіі... Калі б маніфест 19 лютага не з'явіўся так своечасова, то нельга і прадбачыць, які абарот магло б мець для заходняй Русі польскае паўстанне. У гэтую хвіліну заход-

не-рускі народ гучна і па-геройску заявіў, што ён існуе, што ён жадае свету ісціны і ведаў»[1].

Першыя рускія школы з'явіліся на тэрыторыі Беларусі яшчэ падчас кіравання Кацярыны II. Яны нічым не адрозніваліся ад тых, што існавалі ў цэнтральных губернях. З 1830-х гг. урад пачаў адкрываць школы ў сёлах для дзяцей дзяржаўных і ўдзельных сялян, але не за кошт казны, а на спецыяльныя зборы з сялян. Клопат аб асвеце памешчыцкіх сялян урад як Аляксандра I, так і Мікалая I лічыў справай памешчыкаў. Аднак апошнія ў большасці сваёй разглядалі народную адукацыю і дзейнасць урада ў гэтай галіне як шкодную задуму. Нават пісьменнік М.В.Гогаль быў упэўнены, што «вучыць мужыка грамаце ...ёсць сапраўды глупства».

Да школьнай рэформы 1863 г. пэўную ролю ў распаўсюджванні першапачатковых ведаў адыгралі валасныя вучылішчы, якія дзейнічалі пры валасных праўленнях. Настаўнікі ў іх прызначаліся губернатарам з ліку асоб, якія скончылі павятовыя вучылішчы і праявілі схільнасць да навучання і выхавання дзяцей.

Кіравалі навучальнымі ўстановамі «адпаведныя людзі», у асноўным выхаванцы расійскіх духоўных акадэмій, якія траплялі ў Беларусь пераважна з велікарускіх губерняў. 14 красавіка 1862 г. папячыцель Віленскай навучальнай акругі А.П.Шырынскі-Шыхматаў прадставіў міністру народнай асветы А.В.Галаўніну асноўныя тэзісы аб асаблівасцях Паўночна-Заходняга краю. У іх адзначалася неабходнасць правядзення адпаведнай палітыкі ў дачыненні да народнай школы, у прыватнасці, ажыццяўлення кантролю за адкрыццём школ. Настаўнікі павінны былі карыстацца правамі дзяржаўных служачых, маглі атрымліваць чыны і прадстаўляцца да ўзнагарод[2].

На арганізацыю школ Міністэрства народнай асветы выдаткавала 10 тыс. рублёў. Новыя вучылішчы вырашылі адкрыць перш за ўсё ў Віленскай, Гродзенскай губернях і Навагрудскім павеце Мінскай губерні, дзе, нягледзячы на моцны ўплыў каталіцызму, частка насельніцтва была праваслаўная. У маі 1862 г. А.П.Шырынскі-Шыхматаў накіраваў у паветы Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губерняў чыноўнікаў з шырокімі паўнамоцтвамі адносна выбару месц для арганізацыі вучылішчных пунктаў і прызначэння настаўнікаў. На працягу двух месяцаў на тэрыторыі гэтых губерняў была адкрыта 101 школа[3].

Дапамогу ў гэтай справе аказваў Літоўскі мітрапаліт Іосіф, які наказаў мясцовым праваслаўным святарам не толькі падтрымліваць чыноўнікаў, але і самім працаваць у новых школах. Настаўнікамі ўрадавых школ прызначаліся выхаванцы філасофскіх класаў Літоўскай і Мінскай духоўных семінарый, святары, дзякі, прычотнікі, для якіх былі арганізаваны трохтыднёвыя педагагічныя курсы ў Мінску і Вільні. Будучых настаўнікаў знаёмілі з метадамі навучання пісьму, чытанню і арыфметыцы. Ім даводзілі, што «вучэбнае начальства глядзіць на іх не як на звычайных настаўнікаў рускай граматы, але як на самых дзейсных праваднікоў рускіх ідэй, рускай адукацыі ў народзе»[4].

Адначасова са стварэннем вучылішчаў вялася распрацоўка праекта Статута агульнаадукацыйных навучальных устаноў. Асаблівасці школьнай рэформы ў заходніх губернях былі абумоўлены сялянскім рухам і паўстаннем 1863—1864 гг. 23 сакавіка 1863 г. былі зацверджаны «Временные правила для народных школ в губерниях: Виленской, Ковенской, Гродненской, Минской, Могилевской и Витебской». «Положение о начальных народных училищах» ад 14 чэрвеня 1864 г. на беларускія землі не распаўсюджвалася. «Временные правила» так і дзейнічалі да канца XIX ст. У адпаведнасці з імі ствараліся дырэкцыі народных вучылішчаў у кожнай губерні і вучылішчныя саветы пры дырэкцыі, а таксама інспекцыі народных вучылішчаў.

Вялікую ролю ў дзейнасці народных школ рэформа 1863 г. адводзіла мясцовым праваслаўным святарам, якія назіралі за рэлігійным і маральным станам настаўнікаў, вучняў і іх бацькоў, і паведамлялі свае заўвагі настаўнікам ці нават вучылішчнаму савету.

«Інструкцыя» 1879 г. вызначала абавязкі вучылішчных саветаў: адкрыццё і забеспячэнне школ, нагляд за аб'ёмам, зместам і характарам выкладання, прызначэнне ў вучылішчы Міністэрства народнай асветы настаўнікаў і настаўніц, зацвярджэнне асоб, якіх выбіралі на настаўніцкія пасады для сваіх школ гарадскія і сельскія грамадствы, і інш. Саветы павінны былі рабіць прадстаўленні папячыцелю Віленскай навучальнай акругі наконт узнагарод і прызначэння дапамог настаўнікам за добрую працу і тэрміновага звальнення тых, каго прызнавалі нядобранадзейным[5].

Настаўнікаў з мясцовых жыхароў, якія б былі добранадзейныя і ведалі рускую мову, у 1863—1864 гг. было зусім мала. Віленскі генерал-губернатар М.М.Мураўёў арыентаваў сваіх падначаленых на запрашэнне на настаўніцкія пасады з цэнтральных губерняў «тых, хто скончыў і не скончыў духоўныя семінарыі». Аднак многія лічылі, што «гэты элемент толькі з гвалтам мог асесці на працы сярод сялян»[6]. Крытыкаваў такі падыход і вядомы педагог В. Золатаў, які наведаў шэраг вучылішчаў Магілёўскай губерні. Ён пісаў, што недастаткова нават выдатна закончыць семінарскі курс, каб прымаць на сябе «такія надзвычай важныя абавязкі без папярэдняй падрыхтоўкі... Якое ж будзе становішча чалавека яшчэ без практыкі ў жыцці, адарванага ад роднага месца і закінутага на адзіноту ў край, зусім для яго новы, у кола людзей, з якімі на першых парах цяжка будзе нават паразумецца?... На такое добраахвотнае выгнанне можа прымусіць ці страшэнная беднасць, ці надзея на абы, ці шчыра місіянерскае захапленне справай»[7]. Аднак урадавая кадравая палітыка заставалася нязменнай. Выхадцы з цэнтральных губерняў Расіі, якіх у Беларусь прыехала няшмат, у асноўным атрымлівалі прызначэнні ў гарадскія вучылішчы.

Перадавая грамадскасць разумела, што пасля разгрому паўстання 1863—1864 гг. народная адукацыя пачала разглядацца ўрадам як лепшы сродак для супрацьдзеяння «польскім пачаткам». Для гэтага былі «прыцягнуты да займання настаўніцкіх пасад лепшыя

рускія сілы са звальненнем палякаў»[8]. Новы папячыцель Віленскай навучальнай акругі І.П.Карнілаў у запісцы М.М.Мураўёву «О замене польских учителей русскими» ад 12 ліпеня 1864 г. адзначаў, што настаўнікі з Расіі павінны заняць у першую чаргу ўсе выкладчыцкія месцы ў гімназіях, прагімназіях і трохкласных павятовых вучылішчах, бо «штодзённы вопыт пераконвае, што дастаткова прысутнасці аднаго настаўніка-паляка, каб пазбавіць педсаветы ўсялякай сілы і перашкаджаць узаемнаму даверу і абмену думкамі»[9].

У цыркуляры М.Мураўёва «Об искоренении тайного обучения польскому языку в селах и деревнях», выдадзеным у 1864 г., гаварылася, што мовай выкладання павінна быць руская, каб настаўнікі школ «былі з рускіх ураджэнцаў замест былых тубыльцаў, звольненых і аддаленых ад пасад». У навучальных установах вучням забаранялася размаўляць на мясцовай мове паміж сабой, з настаўнікамі і чыноўнікамі вучэбнага ведамства. Генерал-губернатар выступіў супраць распаўсюджвання буквароў і кніг на польскай мове, бо яны настройваюць народ супраць урада. Без дазволу дырэкцыі народных вучылішчаў ніхто, акрамя права-слаўнага духавенства, не меў права займацца навучаннем сялян. Цыркулярам 1864 г. прадугледжвалася штрафаваць настаўнікаў «тайных школ» па 100 руб., а затым «браць іх пад арышт для далейшых распараджэнняў»[10]. Значна пазней, у 1910 г., Янка Купала пісаў: «Дырэктар — гэта асобы ў Беларусі тып настаўніка-вандроўніка, тып, ужо выміраючы ў выніку настойлівага праследавання ў нашым краі пазашкольнага навучання дзяцей, асабліва людзьмі, якія не мелі на гэта спецыяльных казённых паперак»[11].

Адкрыццё новых школ у шэрагу выпадкаў варожа сустракалася польскімі памешчыкамі і рымска-каталіцкім духавенствам. Сялян пужалі, што хлопчыкаў вучаць рускай пісьменнасці, каб выслаць на работу, напрыклад, на Амур, альбо забраць у салдаты, а дзяўчат — у Маскву на фабрыкі. Ксяндзы пагражалі сялянам пазбаўленнем прычашчэння, калі іх дзеці пойдуць у рускую школу.

У 1860-я гг. у Гродзенскай губерні былі выпадкі адкрытага пратэсту супраць рускай школы і настаўнікаў. Так, міравы пасрэднік Брэсцкага павета Выганоўскі адабраў вучылішча ў настаўніка-праваслаўнага святара і перадаў яго выхадцу з Царства Польскага Адзінцу. Той прыняў школу, надзяліў бясплатна хлопчыкаў польскімі букварамі і пачаў навучанне на польскай мове. У Слонімскім павеце валасны старшыня выкінуў з Люшнеўскай школы класную мэблю, закрыў школу і не пусціў настаўніка.

Да барацьбы з «тайным навучаннем» урад прыцягваў і вясковых настаўнікаў. Яны павінны былі паведамляць вучылішчнаму савету пра існаванне недазволеных школ. Так, у 1887 г. настаўнік Дудзінскага вучылішча Ігуменскага павета данёс у Мінскую дырэкцыю народных вучылішчаў, што знайшоў у сваёй воласці перасоўную школу, у якой дзяцей вучылі польскай і рускай пісьменнасці. «Пры аглядзе школы, — адзначаў настаўнік, — я паспрабаваў адабраць знойдзеныя мною польскія падручнікі, але гэта, па прычыне супраціву тамтэйшага настаўніка, не ўдалося зрабіць»[12].

У дырэкцыю паступіў шэраг рапартаў ад настаўнікаў з Мазырскага і Пінскага паветаў. У іх гаварылася пра тое, дзе і кім былі адкрыты недазволеныя школы, і што валасныя старшыні перашкаджалі ім выявіць недазволенае навучанне, якое па дамове паміж сялянамі трымалася ў тайне. У 1899 г. у судзе было разгледжана 5 спраў аб «тайных школах» у Віцебскай губерні, у 1902 г. — 4 справы, па якіх абвінавачаны 7 чалавек[13].

Не асабліва дапамагалі ўраду ў ліквідацыі недазволеных школ і "Временные правила об наказаниях за «тайное обучение», выдадзеныя ў 1892 г., якія распаўсюджваліся на ўкраінскія, літоўскія і беларускія землі і прадугледжвалі штраф памерам 300 руб. ці арышт на 3 месяцы для заснавальнікаў школ і тых, хто садзейнічаў іх дзейнасці.

Колькасць тайных школ павялічвалася, што з'яўлялася адной з форм барацьбы супраць русіфікатарскай палітыкі царызму. «Тайныя школы» былі ў асноўным двух тыпаў: руска-беларускія і польскія. Устанавіць іх колькасць і колькасць настаўнікаў у іх цяжка, бо ў архівах захаваліся звесткі толькі пра выяўленыя школы. У Слуцкім павеце, напрыклад, за 1905—1907 гг. былі закрыты 72 «тайныя школы». Самы актыўны ўдзел у стварэнні беларускамоўных школ на Гродзеншчыне і Міншчыне прынялі А.Пашкевіч (Цётка), У.Ф.Луцэвіч, Я.Колас і іншыя дзеячы. З мэтай забеспячэння такіх школ настаўніцкімі кадрамі намаганнямі Цёткі і І.Луцкевіча былі адкрыты бясплатныя беларускія курсы.

Недазволеныя школы існавалі таксама на тэрыторыі Украіны і Літвы. Настроіць грамадскасць супраць рускай адукацыі тут, як у Беларусі, дапамагала рымска-каталіцкае дўхавенства. Так, ксёндз І.Шапара пераконваў не пасылаць дзяцей у Цэйкінскую школу, дзе выкладала праваслаўная настаўніца. Ён неаднаразова гаварыў, што «на Літве не патрэбны рускія школы і настаўнікі, а толькі літоўскія» і заклікаў да арганізацыі «свайго» навучання[14].

Больш глыбокага і аб'ектыўнага даследавання патрабуе дзейнасць губернскіх інспекцый народных вучылішчаў. У дарэвалюцыйнай буржуазна-ліберальнай, а затым і ў савецкай гістарыяграфіі яна атрымала ў асноўным негатыўную ацэнку. Інспекцыю характарызавалі як паліцэйскую, заснаваную на бюракратызме і самавольстве, якая замаруджвала развіццё народнай адукацыі. Г.Фальбарк і В.Чарналускі лічылі шкоднай і непатрэбнай такую працу, якая «прыняла характар не педагагічны, а паліцэйска-адміністрацыйны»[15].

Безумоўна, ахоўную функцыю інспекцый народных вучылішчаў нельга адмаўляць. У Беларусі на інспекцыю ўсклалі абавязкі своеасаблівай паліцыі бяспекі. У 1865 г. Міністэрства народнай асветы прапанавала дадаткова зацвердзіць пяць інспектарскіх пасад на тэрыторыі Віленскай навучальнай акругі, бо «пры нядобразычлівасці палякаў да рускіх школ, пры

тайных падкопах і супрацьдзеяннях, якія могуць узмацніцца пры ўсялякім зручным выпадку, нельга пакідаць вучылішчы і настаўнікаў без асаблівага нагляду». Аднак у 1870 г. штат інспектараў быў павялічаны яшчэ больш, з 14 да 24 чалавек, а ў 1872 г. на 6 тыс. рублёў павялічыліся сродкі на камандзіроўкі чыноўнікаў ад адукацыі ў вучылішчы[16].

Як адзначаў вядомы педагог Н.А.Корф, інспектар сапраўды з'яўляўся важнай фігурай, мог уплываць на паляпшэнне ці пагаршэнне складу настаўніцкага корпуса, на змяненне прыёмаў і метадаў навучання і выхавання ў школе, нават на колькасць школ і вучняў. У многім рашэнні інспектараў станоўча ўплывалі на развіццё пачатковай народнай адукацыі. Так, інспектар Мінскай дырэкцыі народных вучылішчаў А.Нахараў, якога высока цанілі як адказнага чалавека, у 1883 г. падрыхтаваў запіску-заяву на пасяджэнне вучылішчнага савета. Невукаў і дрэнных прафесіяналаў ён называў «дурнымі настаўнікамі» і патрабаваў не пераводзіць іх з аднаго вучылішча ў іншае, ад аднаго інспектара да іншага, а звальняць са школы[17].

У прыклад інспектары ставілі старанных і кваліфікаваных настаўнікаў. Так, А.Шахо падчас рэвізіі ў 1908 г. Баярскага і Бабараўскага вучылішчаў Віцебскай губерні высока ацаніў працу настаўнікаў А.Саўчанкі і М.Тамкоўскага. Інспектар адзначаў, што яны вызначаюцца «разумовым развіццём і педагагічнай вопытнасцю» і «стараюцца паставіць вучэбна-выхаваўчую справу на патрэбную вышыню, ад іх нельга большага патрабаваць»[18].

Інспектары складалі спісы настаўнікаў на прэміі і іншыя заахвочванні, рабілі заўвагі валасным праўленням наконт дрэннага стану большасці вучылішчных будынкаў. Разам з тым нярэдка на пасаду траплялі асобы з нізкімі прафесійнымі здольнасцямі і шкоднымі звычкамі. Практычна ўсе настаўнікі ўспрымалі візіт інспектара «як начальства, якое з'яўляецца для расследавання, ці няма якіх недаглядаў, і для спагнанняў з вінаватых». Вельмі красамоўна апісаў гэта Якуб Колас: «Інспектар увайшоў, як цар: важны, строгі, з такім выглядам, як бы ён трымаў у руках лейцы, каб не разбеглася, спудзіўшыся, зямля... Ён нават не меў часу паглядзець на таго, каму даваў руку»[19].

Многія настаўнікі баяліся і не любілі інспектараў, пісалі, што іх праца ацэнена неаб'ектыўна. А.Самчук з Дабраслаўскай школы Пінскага павета адзначаў: «Інспектар імкнецца шкодзіць у службовых маіх справах хлуслівымі даносамі»[20]. Такім чынам, відавочна, што інспектары, якія ў асноўным выконвалі функцыі нагляду і кантролю, дапускалі ў сваёй працы перагібы і памылкі. Аднак альтэрнатывы гэтаму інстытуту ў тых умовах царскі ўрад не бачыў.

Паводле «Положения об управлении школами церковноприходскими и грамоты ведомства православного вероисповедания», прынятага 19 чэрвеня 1896 г., быў зацверджаны склад Епархіяльнага вучылішчнага савета. Ён складаўся са старшыні, 8 членаў, павятовых і мясцовых дабрачынных назіральнікаў. Назіральнікі праводзілі нагляд за царкоўнай адукацыяй сваёй епархіі. Падчас рэвізіі цэркваў яны ў абавязковым парадку наведвалі царкоўнапрыходскія школы, звярталі ўвагу на вучэбную і гаспадарчую часткі, умовы існавання школ і працу настаўнікаў. Калі рэвізіі народных вучылішчаў праводзіліся адзін раз у год, то царкоўнапрыходскіх школ не менш як два разы. Адзін з настаўнікаў паведамляў, што «ў летапісах нашай царкоўнапрыходскай школы заўсёды і ва ўсім аказваецца вінаватым настаўнік ці настаўніца, і нязменны фінал узнікшых непаразуменняў — перавод настаўніка на карысць службе». Затое «нават самыя выразныя злачынствы з боку бацюхнаў пакрываюцца, каб толькі не даваць агалоскі гэтай справе»[21].

Такім чынам, з мэтай ідэалагічнага кантролю царызм шырока выкарыстоўваў не толькі дзейнасць праваслаўнай царквы, але і пачатковай школы. Забараніўшы мясцовую нацыянальную школу з выкладаннем на роднай мове, урад распаўсюджваў рускую школу, якая працавала па рэлігійна-манархічных кніжках. Да пачатку XX ст. руская мова заняла ў Беларусі дамінуючыя пазіцыі і выцесніла ўсе астатнія на паўлегальнае становішча.

Непасрэдным праваднікам сваіх мэт урад лічыў рускага па духу настаўніка. Падрыхтоўку такіх кадраў у Паўночна-Заходнім краі, на думку тагачаснага міністра народнай асветы А.В.Галаўніна, павінны былі весці настаўніцкія семінарыі. У 1864 г. такая навучальная ўстанова была адкрыта ў Маладзечне, а пазней яны былі створаны і ў іншых гарадах Віленскай навучальнай акругі. Усе мерапрыемствы ў дадзеным кірунку зводзіліся да таго, каб, па-першае, пачаць пры невялікіх грашовых затратах падрыхтоўку настаўнікаў народных школ, выхаваных належным чынам і адданых дзяржаве і праваслаўнай царкве, і, па-другое, гэтыя семінарыі разглядаліся як прататып будучых дзяржаўных настаўніцкіх семінарый ва ўсёй Расійскай імперыі.

Ураду і тым органам, што неслі адказнасць за стан адукацыі на тэрыторыі беларускіх зямель, у значнай ступені ўдалося сфарміраваць паслухмянае царызму настаўніцтва, якое даволі актыўна праводзіла палітыку па русіфікацыі беларускага народа. Гэтаму шмат у чым паспрыялі мерапрыемствы, якія праводзіліся адразу пасля падаўлення паўстання 1863—1864 гг. М.Мураўёвым і яго паслядоўнікамі. Нягледзячы на тое, што настаўніцкія семінарыі давалі лепшых для таго часу педагогаў, у іх, як заўважае Я.Троська, «беларусаў перараблялі ў сапраўдна-рускіх» людзей, якія пазней падчас працы ў сельскай школе «праводзілі чарнавую работу русіфікацыі і прышчаплялі ідэі расійскае вялікадзяржаўнасці» маладому пакаленню[22].

У той жа час, нягледзячы на спецыфічны характар семінарскай асветы, спецыяльна падабраныя кадры і сам характар устаноў, з іх выходзілі таксама шмат настаўнікаў-беларусаў, апазіцыйна настроеных супраць існуючага ладу, выдатных педагогаў, прыхільнікаў ідэі нацыянальна-культурнага і палітычнага адраджэння Беларусі. Настаўніцкія семінарыі скончылі такія дзеячы беларускага адраджэння, як Я.Колас,

С.Некрашэвіч, А.Галіна, А.Сташэўскі, П.Дземідовіч, С.Рак-Міхайлоўскі, М.Шыла, Я.Лёсік, М.Чарот, Л.Калядка і іншыя.

У гады Першай сусветнай вайны кайзераўская адміністрацыя ў супрацьвагу русіфікатарскай палітыцы царызму пачала ажыццяўляць сваю акупацыйную палітыку на занятай тэрыторыі і ў пэўнай ступені дазволіла развіццё беларускай адукацыі. Для падрыхтоўкі настаўнікаў у 1915 г. у Вільні былі арганізаваны трохмесячныя педагагічныя курсы. З верасня 1916 г. на месцы Свіслацкай семінарыі, эвакуіраванай у г. Медынь Калужскай губерні, пачала працу беларуская настаўніцкая семінарыя, у якой да 1918 г. было падрыхтавана 144 педагога[23].

Такім чынам, у Беларусі з часу далучэння да Расійскай імперыі ўкаранялася дзяржаўная мадэль падрыхтоўкі настаўнікаў, сфармуліраваная ў афіцыйных дакументах і педагагічных працах ахоўна-прапагандысцкай скіраванасці. Паводле гэтай мадэлі, змест педагагічнай адукацыі павінен быў абапірацца на такія сацыяльна-палітычныя і духоўныя каштоўнасці, як самаўладдзе, праваслаўе, народнасць. Асноўнай задачай настаўнікаў лічылася правядзенне дзяржаўнага курсу ў сваёй прафесійнай дзейнасці шляхам выканання строга фіксаваных функцыянальных абавязкаў.

Расійскі ўрад не жадаў рабіць сур'ёзныя і рашучыя крокі, каб хуткімі тэмпамі пашыраць народную адукацыю, і не збіраўся траціць на гэта значныя сродкі. Ужо ў год адкрыцця Маладзечанскай семінарыі было заяўлена, што сістэма семінарый абыходзіцца казне вельмі дарага. Каб пазбегнуць вялікіх выдаткаў, навучанне здольных дзяцей вялі ў народных школах, каб «з саміх сялян праваслаўнай веры маглі выходзіць настаўнікі народных вучылішч і валасныя пісары». У 1865 г. гэтую ж думку падтрымаў і інспектар Слунскі, які прапаноўваў стварыць «узорныя вучылішчы», якія б былі чымсьці накшталт настаўніцкіх семінарый. Пры гэтым «настаўнік не павінен уяўляць, што яму даецца нейкае новае званне, ці ён перастае быць селянінам», «рублёў за 50, за бочкі паўтары хлеба і дазваленне карыстацца сталом разам з дзецьмі такі спецыяльны настаўнік з ахвотаю будзе працаваць»[24].

У адносінах да пачатковай школы адной з галоўных і пастаянных турбот царызму было недапушчэнне ва вучэбных праграмах усяго, што магло спрыяць сапраўднай асвеце народа, абудзіць яго ад патрыярхальнага становішча. Гэта было асноўнай задачай дактрыны «ахоўнай асветы» графа С.С.Уварава. У 1880-я гг. дзяржаўныя і некаторыя грамадскія дзеячы імкнуліся зрабіць працэс навучання больш танным. Ім здавалася, што затрачваць на адукацыю рускага народа па 9,16 капейкі на душу і вучыць яго ў школах з сярэднім гадавым бюджэтам у 270,4 руб. - гэта раскоша. Таму прапаноўвалася шырока выкарыстоўваць распаўсюджаныя ў народзе школы пісьменнасці, у якіх настаўнічалі «салдаты, пастухі і іншыя грамацеі».

Прыхільнікі таннай школы і таннай падрыхтоўкі настаўнікаў знайшлі апору ў царкоўнай праваслаўнай школе. З пачатку 1880-х гг. яна пачала займаць ваяўнічыя пазіцыі ў адносінах свецкай школы. Свяцейшы Сінод выступіў з крытыкай настаўніцкіх семінарый і захадаў урада з мэтай прывабіць сялян у народныя вучылішчы. На думку членаў Сінода, настаўнік меў «высокі аклад» — 150 руб., бясплатную кватэру, ацяпленне, розныя надбаўкі, права дзяржаўнай службы, вызваленне ад павіннасцей, цялесных пакаранняў, намер стварэння пенсійнай касы. Гэтыя льготы, лічылі царкоўнікі, былі дарагім і непатрэбным падарункам. Духоўнае ведамства раіла «не выцягваць народных настаўнікаў з іх асяроддзя... каб яшчэ больш не распладзіць і без таго ўжо вялікага і бескарыснага класа чыноўнікаў», бо так «ствараецца законам новы разрад людзей, непрадукцыйных і разрозненых са сваім саслоўем больш, чым сваёй адукацыяй і асаблівым ва ўсякім выпадку становішчам»[25].

Сінод выступаў за тое, каб прадаставіць духавенству ў міністэрскіх і народных школах «законнае і натуральнае першынства». Перавагу святара-настаўніка бачылі ў тым, што яго не трэба было прываблівацьда жыцця ў сяле, бо ён і так там жыў і працаваў у сваім прыходзе. Грошы, якія адпускаліся на заробак настаўніку, былі б для яго «сапраўдным дабрадзействам», якое б падвоіла даход і «перапоўніла б іх самай глыбокай удзячнасцю да ўрада». Пры такім падыходзе не было б патрэбы вызначаць і прававы статус настаўніка, бо значэнне святара ў прыходзе і адносіны да яго мясцовага насельніцтва як да духоўнага пастыра даўно ўсталяваліся. І апошняе, што лічылася самым галоўным: пры настаўніку-святару ніхто б не адцягваўся ад традыцыйных заняткаў, не выходзіў са свайго ранейшага стану, не абцяжарваў грамадства падаткамі і свабодай ад іх.

Тэзіс аб неабходнасці ў Беларусі самай цеснай сувязі паміж царквой і школай гучаў яшчэ ў пачатку 1860-х гг. Новае «Положение о начальных народных школах» 1874 г. замацоўвала пазіцыі праваслаўнага духавенства. Епархіяльныя архірэі павінны былі ажыццяўляць вышэйшы нагляд за выкладаннем Закону Божага і рэлігійным кірункам усяго навучання. Духавенства мела права ствараць новыя ці закрываць царкоўныя школы без дазволу свецкіх уладаў, працаваць ва ўсіх пачатковых школах выкладчыкамі любых прадметаў. Пагроза сацыяльных незадавальненняў і новая рэвалюцыйная сітуацыя, якая дапаўнялася імкненнем аслабіць каталіцкі ўплыў, прымушала ўрад звярнуцца да праваслаўнай царквы, якая ўсяляк тармазіла развіццё культуры і адукацыі беларускага народа.

Дзейнасць Міністэрства народнай асветы і кіраўніцтва Віленскай навучальнай акругі была накіравана на тое, каб у губернях з праваслаўным насельніцтвам (Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай) распаўсюдзіць школы царкоўнага ведамства. Развіццё сеткі пачатковых народных вучылішчаў планавалася сканцэнтраваць у Гродзенскай, Віленскай і Ковенскай губернях, дзе большасць насельніцтва адмаўлялася ад праваслаўных царкоўных школ. Свайго вышэйшага развіцця сетка царкоўных школ дасягнула на мяжы

XIX—XX стст. На 1 студзеня 1905 г. у Беларусі існавалі 4 990 царкоўных школ і 1 314 народных вучылішчаў[26]. Пасля 1907 г. колькасць царкоўных навучальных устаноў скарацілася.

Станоўчую ролю ў развіцці народнай адукацыі адыгралі земствы. Упраўленні па справах земскай гаспадаркі ў Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях былі ўведзены 2 красавіка 1903 г., у той час як у 34 губернях цэнтральнай Расіі — яшчэ ў 1864 г. Справа з увядзеннем земстваў адлюстроўвала адносіны царскага ўрада да самакіравання ў беларускіх губернях, да польскага дваранскага і каталіцкага ўплыву. Земствы ў Беларусі не ствараліся праз выбары, а камплектаваліся з чыноўнікаў розных устаноў і таму не мелі поўнай самастойнасці. Міністэрства асветы планавала за земскімі ўстановамі пакінуць толькі гаспадарчую частку і клопат пра матэрыяльнае забеспячэнне вучылішчаў, а кіраўніцтва ў адміністрацыйнай і педагагічнай сферы жадала трымаць у сваіх руках. У такім выпадку настаўнік хоць і мог выбірацца земствам, але дапускаўся да працы толькі інспектарам.

Земствы актыўна ўключыліся ў справу. Яны пачалі вывучаць стан пачатковай адукацыі, адкрывалі новыя вучылішчы і ўтрымлівалі іх, назначалі стыпендыі навучэнцам настаўніцкіх семінарый, грашовыя дапамогі настаўнікам, бо ва ўпраўленнях па справах народнай адукацыі добра разумелі, што «недастатковая забяспечанасць адбіваецца на самім складзе асоб, якія ідуць на службу»[27].

Даволі часта земствы з'яўляліся арганізатарамі педагагічных курсаў, з'ездаў і нарад настаўнікаў. Магілёўскае земства, напрыклад, запланавала адкрыць у губерні 25 настаўніцкіх семінарый. Яно склала праект сеткі гэтых навучальных устаноў. Абмяркоўваўся праект аб усеагульным навучанні і ролі ў ім настаўніка. Сваёй дзейнасцю земствы стрымлівалі рост царкоўных школ і памяншалі выдаткі на іх. У Магілёўскай губерні, дзе школ духоўнага ведамства было больш, чым у іншых губернях, сутыкненні адбываліся пры абмеркаванні сеткі ўсеагульнага навучання.

Такім чынам, палітыка ўрада ў дачыненні да настаўнікаў праводзілася так, каб сфарміраваць «ідэальнага» працаўніка ў народнай адукацыі. Ідэал уяўляўся расійскаму ўраду і кіраўніцтву народнай асветай у выглядзе талерантнага, сціплага, непрыкметнага і паслухмянага працаўніка, які добра ўсведамляў важнасць настаўніцкага абавязку, аддана служыў царкве і царскаму трону, у сваёй педагагічнай дзейнасці праводзіў урадавую палітыку.

Падзеі рэвалюцыі 1905—1907 гг. абудзілі свядомасць перадавых і прагрэсіўна настроеных настаўнікаў, у краіне разгарнуўся шырокі грамадска-педагагічны рух. Пытанні рэарганізацыі сістэмы адукацыі станавіліся ўсё больш актуальнымі. Аднак кансерватыўныя колы прадаўжалі трымацца думкі знакамітага рэакцыянера У.М.Пурышкевіча: «Каб не было ў Расіі рэвалюцыі і ўмацоўвалася праваслаўная вера — гнаць настаўнікаў і на іх месца прызначаць салдат»[28]. Пасля Лютаўскай рэвалюцыі Часовы урад зрабіў нязначныя крокі наперад, але істотных змен і рэформ не адбылося. Папячыцель Віленскай навучальнай акругі В.Р.Аляксееў заклікаў усіх работнікаў адукацыі захоўваць былыя парадак і спакой, а навучальныя ўстановы перасцярог «ад усіх выпадковасцей і эксцэсаў».

Можна зрабіць вывады, што развіццё капіталізму ў Расіі штурхала ўрад на пэўныя крокі ў пашырэнні народнай адукацыі. Калі ў 1856 г. у Віленскай навучальнай акрузе было 830 навучальных устаноў з 22 607 навучэнцамі, то на 1 студзеня 1911 г. — 10 287 навучальных устаноў з 544 663 навучэнцамі. За 54 гады колькасць навучальных устаноў узрасла ў 12,4, а навучэнцаў — у 24,1 раза. Калі ў 1868 г. паказчык асветы (лік вучняў на 100 чалавек насельніцтва) у губернях Віленскай навучальнай акругі быў 1,05, то ў 1894 г. у дачыненні да міністэрскіх школ ён узрос да 2,24. У земскіх губернях ён складаў 3,12, а ў сярэднім па еўрапейскай Расіі — 2,93. У 1897 г. у межах сучаснай Беларусі пісьменныя мужчыны складалі 36,4%, жанчыны — 15,2%, разам — 25,7% ад колькасці насельніцтва[29].

У 1914/1915 навучальным годзе ў Віленскай навучальнай акрузе налічвалася 6 667 вучылішчаў і пачатковых школ, 31 мужчынская і 69 жаночых гімназій, 11 рэальных вучылішчаў, 3 настаўніцкія інстытуты, 8 настаўніцкіх семінарый[30].

Як і іншыя буржуазныя рэформы, школьная рэформа 1860-х гг. у Беларусі вызначалася дваістасцю, непаслядоўнасцю і большай рэакцыйнасцю ў параўнанні з цэнтральнымі губернямі Расійскай імперыі. Выдадзеныя заканадаўчыя акты, цыркуляры міністэрства народнай асветы, папячыцеляў і губернатараў сведчылі пра тое, што наступленне рэакцыі ў сферы народнай адукацыі пачалося адразу пасля падаўлення паўстання 1863—1864 гг. З.А.Пастухова адзначала рознае значэнне школьнай рэформы для Расіі і Беларусі. Калі распаўсюджванне школьнага Статута 1864 г. у Расіі мела прагрэсіўнае значэнне, то ва ўмовах Беларусі рэформа з'яўлялася ў першую чаргу ўрадавай рэакцыяй на паўстанне, імкненнем канчаткова знішчыць польскі ўплыў на беларускае насельніцтва і замяніць яго рускім манархічным уплывам. Вызначаючы характэрную асаблівасць урадавай школьнай палітыкі ў Беларусі, беларуская даследчыца С.В.Снапкоўская таксама падкрэсліла, што гэта была русіфікацыя, якая праводзілася ў адпаведнасці з тэорыяй «афіцыйнай народнасці»[31].

Самаўладдзе адчувала страх перад любымі рэформамі. У неадукаванасці народа яно бачыла адзін з надзейных гарантаў самазахавання, лічыла, што сялян трэба трымаць далей ад школы. Але паралельна стваралася народная школа, узнікалі педагагічныя навучальныя ўстановы. У руках царскага ўрада адукацыя з'яўлялася сродкам сацыяльнага рэгулявання і кантролю, што выражалася ў пашырэнні сеткі царкоўнапрыходскіх школ, стрымліванні падрыхтоўкі педагагічных кадраў, устанаўленні строгага нагляду за дзейнасцю настаўнікаў і іх палітычнай добранадзейнасцю. Фінансавыя пытанні, у тым ліку і матэрыяльнае забеспячэнне настаўніцкай інтэлігенцыі, урад імкнуўся вырашыць за кошт самога народа і земскіх

устаноў. Самаўладдзе прыклала шмат намаганняў, каб зрабіць настаўніка «казённай прыладай у выкананні казённых загадаў», але поўнасцю гэтай мэты яму дасягнуць не ўдалося.

---

[1] Еленёв Ф. Польская цивилизация и её влияние на Западную Русь. СПб., 1963. С. 81, 83.

[2] Корнилов И. Русское дело в Северо-Западном крае. СПб., 1908. С. 37—38.

[3] Белецкий А.В. Сороколетие русской начальной школы в Северо-Западном крае России. Вильна, 1905. С. 15—16.

[4] Белецкий А.В. Сороколетие русской начальной школы в Северо-Западном крае России. Вильна, 1905. С. 21.

[5] Настольная книга по народному образованию: в 3 т. / Сост. Г.Фальборк, В Чарнолуский. Т. III. СПб., 1904. С. 1874.

[6] Троська Я. Некаторыя моманты з дарэвалюцыйнае асьветы на тэрыторыі сучаснае Магілёўшчыны // Полымя, 1926. № 1. С. 132.

[7] Золотов В. Записка о сельской грамотности в Могилёвской губернии. СПб., 1864. С. 8.

[8] Белоруссия и Литва. Исторические судьбы Северо-Западного края / Н.И.Петров. СПб., 1890. С. 372.

[9] Корнилов И. Русское дело в Северо-Западном крае. Материалы по истории Виленского учебного округа преимущественно в Муравьёвскую эпоху. СПб, 1908. Вып. 1. С. 82.

[10] Там жа. С. 51—53.

[11] Ярош М.Р. Пясняр роднай зямлі. Мн., 1982. С. 24.

[12] НГАБ. Ф. 458, воп. 1, спр. 124, арк. 65.

[13] Там жа. Ф. 2507, воп. 1, спр. 2675, арк. 1.

[14] Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва. Ф. 3, воп.2, спр. 2, арк. 4.

[15] Фальборк Г., Чарнолуский В. Народное образование в России. Исторический очерк. СПб, Б.г. С. 44.

[16] Кириллов М.К. Начальная школа Белоруссии во второй половине XIX и в начале XX в. (1860—1907) // Из истории школы Белоруссии и Литвы / Под ред. В.З. Смирнова. М., 1964. С. 61.

[17] НГАБ. Ф. 458, воп. 1, спр. 62, арк. 138.

[18] Там жа. Ф. 2507, воп. 1, спр. 1674, арк. 6, 48.

[19] Тарас Гушча (Якуб Колас). У Палескай глушы. Мн., 1928. С. 171.

[20] НГАБ. Ф. 458, воп. 1, спр. 107, арк. 926.

[21] Д. и К. Из жизни церковно-приходской школы // Голос учителя. Витебск, 1908. С. 26.

[22] Троська Я. Некаторыя моманты з дарэвалюцыйнае асьветы на тэрыторыі сучаснае Магілёўшчыны // Полымя. 1926, № 9. С. 132.

[23] Głogowska H. Bialorus 1914—1929. Kultura pod presja polityki. Białystok, 1994. № 2. S. 37.

[24] НГАБ. Ф. 2507, воп.1, спр. 878, арк. 135—136.

[25] Записка о народных училищах. СПб., 1882. С. 44.

[26] Асвета і педагагічная думка ў Беларусі: Са старажытных часоў да 1917 г. / М.А. Ткачоў, У.С. Пасэ, Г.Р. Сянькевіч і інш. Мн., 1985. С. 370, 374.

[27] НГАБ. Ф. 2519, воп. 1, спр. 15, арк. 107.

[28] Антология педагогической мысли Белорусской ССР / Сост. Э.К. Дорошкевич и др. М., 1986. С. 301

[29] Улащик Н.Н. Грамотность в дореволюционной Белоруссии // История СССР. 1968, № 1. С. 108.

[30] Пастухова З.А. Віленская навучальная акруга // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т. 2. Мн., 1994. С. 284.

[31] Снапкоўская С.В. Адукацыйная палітыка і школа на Беларусі ў канцы XIX—пачатку XX ст. Мн., 1998. С. 57.